ВОДЗЫЎ
на аўтарэферат дысертацыі
**КІТУРКА ІРЫНЫ ФЁДАРАЎНЫ**
"Станаўленне і развіццё дзяржаўнай мытнай службы
Вялікага Княства Літоўскага (1764–1795 гг.)",
якая прадстаўлена на саісканне вучонай ступені
доктара гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

*Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навук, па якіх яна прадстаўлена да абароны.* Тэма дысертацыі І. Ф. Кітурка належыць да значных у айчынных гістарычных даследаваннях, аўтарэферат дысертацыі сведчыць, што змест даследавання цалкам суаднесены з галіной "гістарычныя навукі" і спецыяльнасцю 07.00.02 – айчынная гісторыя.

*Актуальнасць тэмы дысертацыйнага даследавання.* Актуальнасць дысертацыі абгрунатавана неабходнасцю характарыстыкі ў гістарычнай рэтраспектыве сістэмы дзяржаўнага кіравання і працэсаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў кантэксце эпохі XVIII ст. Пашырэнне ведаў па заяўленай тэме можа быць карысным для абгрунтавання шэрагу палажэнняў у канцэпцыі беларускай дзяржаўнасці і знайсці свае практычнае выкарыстанне ў выкладанні студэнтам вышэйшай школы дысцыпліны "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці", "Гісторыя Беларусі".

*Навуковы ўклад саіскальніка у рашэнне навуковай праблемы і яго значнасць.* Навуковы ўклад І. Ф. Кітурка можна вызначыць як істотны, які стварае трывалы фундамент для дальнейшых распрацовак сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі, садзейнічае асвятленню з пазіцый гістарычнай навукі пытанняў эканамічнай бяспекі краіны ў мінулым.

*Навізна палажэнняў, якія вынесены на абарону.* І. Ф. Кітурка ўлічыла дасягненні папярэднікаў (беларускай, польскай, украінскай, літоўскай і расійскай гістарыяграфіі) і здолела выканаць свае даследаванне як прынцыпова новае, якое адрозніваецца ад прац папярэднікаў. У дысертацыі ўпершыню паказаны станаўленне і арганізацыя дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ, характар дзейнасці мытнага кантролю. Аўтар вызначае шляхі вырашэння кадравага пытання ў межах мытнай службы, патрабаванні да вядзення справаводства. Ірына Фёдараўна засяродзіла ўвагу на фінансавым аспекце функцыянавання мытнай службы ВКЛ. Яна аргументавана прадставіла эвалюцыю мытнай службы ад органа па выкананні фіскальных функцый да спецыяльнага інстытута, якія ўдзельнічаў у рэалізацыі дзяржаўнай эканамічнай палітыкі. Навізну дысертацыі таксама надае зварот да пытання аб правілах этыкі мытнікаў, фіксацыя іерархічнай структуры кіравання і правіл субардынацыі.

*Дакладнасць і абгрунтаванасць вынікаў.* Пастаноўка мэты і задач даследавання, выбар метадалогіі адэкватны сутнасці і спецыфіке правядзення даследаванняў па айчыннай гісторыі. Навуковая праблемы вырашана на высокім навукова-тэарэтычным узроўні з прыцягненнем шырокага кола крыніц, большасць з якіх ўпершыню выяўлены і кампетэнтна прааналізаваны аўтарам.

І. Ф. Кітурка сярод іншых збораў крыніц па тэме падкрэслівае каштоўнасць фонду Скарбавай камісіі ВКЛ, які захоўваецца ў Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы. Аўтар кваліфікавана выдзяліла групы крыніц, на падставе якіх выконвалася дысертацыйнае даследаванне, дала ім адпаведную характарыстыку, пазначыла спецыфіку і дала аб’ектыўную ацэнку кожнага віду матэрыялаў для вырашэння канкрэтных задач.

Высновы, сфармуліраваныя ў дысертацыі, адлюстроўваюць новы ўзровень навуковага асэнсавання дзяржаўнага развіцця ВКЛ, а таксама эканамічнай мадэлі, якая склалася на Беларусі ў новы час.

*Ступень апублікаванасці вынікаў.* Вынікі дысертацыйнага даследавання апублікаваны, у агульным пераліку 36 найменняў, сярод іх значнае месца займаюць дзве манаграфіі, артыкулы ў айчынных і замежных выданнях, у тым ліку 19 часопісах, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь да публікацыі вынікаў навуковых даследаванняў. Звернем асаблівую ўвагу на раздзел, прысвечаны пытанню ўмацавання эканамічнай самастойнасці ВКЛ, надрукаваны ў 1 томе выдання “История белорусской государственности” (Мінск, 2018), пазіцыя № 25. Матэрыялы дысертацыі прайшлі апрабацыю на 26 рэспубліканскіх і міжнародных навуковых канферэнцыях. У аўтарэфераце пазначана наяўнасць 11 актаў ўкаранення вынікаў дысертацыі ў адукацыйны працэс у вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь.

*Навуковая і практычная значнасць даследавання.* Ірына Фёдараўна Кітурка закранула праблемы нарматыўна-прававога, інстытуцыянальнага і кадравага забеспячэння мытнай службы ВКЛ, якія маюць рэсурс для далейшай дэталізацыі на канктэртных матэрыялах. Атрыманыя вынікі карысныя для ўкаранення ў выкладчыцкую дзейнасць, музейную сферу і інш., яны валодаюць належным навуковым патэнцыялам і атрактыўнай фактурай для гісторыка-прававога выхавання супрацоўнікаў мытнай службы ў Рэспубліцы Беларусь. Матэрыялы дысертацыі І. Ф. Кітурка магчыма задзейнічаць пры стварэнні даведнікаў па гістарычнай тэрміналогіі перыяду ВКЛ, вучэбна-метадычных дапаможнікаў па эканамічнай гісторыі Беларусі, гісторыі дзяржаўнага развіцця.

*Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія саіскальніку можа быць прысуджана навуковая ступень.* І. Ф. Кітурка зрабіла вялікі ўнёсак у айчынную гісторыю, паколькі раскрыла на новых матэрыялах значны аспект эканамічнага развіцця Беларусі і прадставіла ўласную канцэпцыю фарміравання дзяржаўнай мытнай службы сістэмы ВКЛ.

Аўтарэферат дысертацыі І. Ф. Кітурка “Станаўленне і развіццё дзяржаўнай мытнай службы Вялікага Княства Літоўскага (1764–1795 гг.)”, адпавядае неабходным патрабаванням, азнаямленне з ім дазваляе зрабіць выснову аб тым, што навуковая кваліфікацыя аўтара цалкам адпавядае патрабаванням да саіскальнікаў вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

У адпаведнасці з пп.19, 20 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь І. Ф. Кітурка можа быць прысуджана вучоная ступень доктара гістарычных навук за:

- паказ развіцця мытнай службы ў гістарычным кантэксце як цэласнай сістэмы, звязанай з агульнай рэформай дзяржаўнага апарата ВКЛ, адмовай ад практыкі здачы мыта ў арэнду;

- доказ з'яўлення і функцыянавання мытнай службы ў другой палове XVIII ст. як асобнага інстытута ў сістэме дзяржаўнага кіравання ВКЛ, незалежнага ад Польскай Кароны;

- прасочванне зменаў, якія адбываліся на розных этапах дзейнасці мытнай службы ВКЛ (1764–1795 гг.);

- кваліфікаванае раскрыццё тэрміналогіі, звязанай з гістарычнай атрыбуцыяй мытнай службы ВКЛ, якое ўдакладняе і ўзбагачае навуковыя прадстаўленні аб мінулым.

Водзыў абмеркаваны і зацверджаны на пасяджэнні кафедры гісторыі Беларусі 20 лістапада 2023 г., пратакол № 4.

*Даем згоду на размяшчэнне матэрыялаў водзыва кафедры гісторыі Беларусі УА "ГДУ імя Ф.Скарыны" на аўтарэферат І. Ф. Кітурка ў глабальнай сетцы Інтэрнэт.*

Загадчык кафедры
гісторыі Беларусі
УА "ГДУ імя Ф.Скарыны",
канд. гіст. навук, дац. А. Р. Яшчанка

Подпіс О.Г. Ященко
ЗАВЯРАЮ
Начальнік аддзела кадраў
установы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны"
20.11.2023 О.Г. Зайцева

Установа адукацыі "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны" Рэспубліка Беларусь
АДДЗЕЛ КАДРАЎ